*М. І. Плаўская, аспірант*

# ВЫДАННЕ КАТАЛОГАЎ МУЗЕЙНЫХ КАЛЕКЦЫЙ ЯК ФОРМА ЗАХАВАННЯ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫМІ МУЗЕЯМІ БЕЛАРУСІ

Адным з асноўных накірункаў навуковай дзейнасці музеяў на сённяшні дзень з'яўляецца выданне каталогаў музейных калекцый. Гэта задача не толькі захавальніцкай, але і навукова-асветніцкай дзейнасці.

На сённяшні дзень каталогі граюць важную ролю ў папулярызацыі музейнай спадчыны. Іх асноўнае прызначэнне – азнаямленне шырокага кола грамадскасці, якое цікавіцца гісторыяй, культурай, літаратурай, мастацтвам, з помнікамі, якія захоўваюцца ў музеі. Значную ролю граюць каталогі ў папулярызацыі навуковых ведаў, прапагандзе нацыянальных каштоўнасцей.

Каталог музейных калекцый – гэта музейнае выданне навукова-даведачнага характару. Ён утрымлівае звесткі пра склад музейных калекцый, палягчае іх вывучэнне, спрыяе абмену навуковай інфармацыяй.

Будуецца каталог на аснове пэўнай класіфікацыі музейных прадметаў, утворанай у працэсе класіфікацыі фондаў. Асноўныя каталогі ствараюцца у фондавых падраздзяленнях з улікам асаблівасцей музейных прадметаў, якія знаходзяцца ў зборы дадзенага музея.

Такім чынам, каталог – сістэматызаваны спіс, пералік аднародных прадметаў, вынік навуковай работы па вывучэнні і сістэматызацыі збору, від паліграфічнай прадукцыі.

Існуе вялікая колькасць розных форм каталогаў, якія адрозніваюцца як па змесце, так і па спосабах падачы інфармацыі. Найбольш простая класіфікацыя пададзена ў тэрміналагічным слоўніку А. М. Кантора, якая ўключае два віды музейных каталогаў: музейныя і выставачныя.

Е. Г. Шчурына адзначае, што «ў адпаведнасці з тыпалогіяй выдання музейныя каталогі могуць быць аднесены да навуко-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вых, навукова-даведачных і навукова-папулярных выданняў»*. Кожны з адзначаных тыпаў выконвае сваю функцыю. Першыя два выконваюць даследчую навуковую функцыю, трэці – у большай ступені асветніцкую.

Сёння літаратурна-мемарыяльныя музеі актыўна займаюцца выданнем каталогаў музейных калекцый. Яны выконваюць адразу некалькі функцый.







Па-першае, яны дапамагаюць папулярызацыі музейных калекцый. Спецыфіка літаратурных і літаратурна-мемарыяльных музеяў заключаецца ў тым, што большасць захоўваемых у іх фондах прадметаў – гэта пісьмовыя крыніцы. І выстаўляць у музейнай экспазіцыі (пастаяннай і часовай) іх немагчыма ў поўным аб'ёме. Такім чынам, дзякуючы каталогам, можна прадставіць усё багацце збораў шырокай грамадскасці.

Таксама вялікую ролю граюць каталогі і з пункту гледжання захавання культурнай спадчыны. Зразумела, што пісьмовыя крыніцы з цягам часу могуць быць страчаны, асабліва калі іх актыўна выкарыстоўваць. Для іх патрэбныя асаблівыя ўмовы захоўвання, а таксама абмежаванасць доступу да іх. Таму дзякуючы каталогам з'яўляецца магчымасць даследчыкам вывучыць калекцыі, не трымаючы іх у руках, дыстанцыйна.

На сённяшні дзень можна вылучыць два віды каталогаў, якія ствараюцца літаратурна-мемарыяльнымі музеямі. Адны ствараюцца для навукоўцаў («Рукапісная спадчына Янкі Купалы» ў

* Щурина, Е. Г. Каталогизация музейного собрания. Система музейных каталогов. Подготовка к изданию каталогов музейных собраний / Е. Г. Щурина // Вестник Кирилло-Белозерского музея [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.kirmuseum.ru. – Дата доступа : 19.05.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2-х частках), а другія – для больш шырокага кола грамадства (каталогі фатаграфій, афіш, выставак).

У першых даецца падрабязная атрыбуцыя прадмета, з мінімальным ілюстрацыйным матэрыялам. А другія – ілюстраваныя выданні, з кароткім апісаннем. Такія каталогі дапаўняюцца лірычнымі адступленнямі, успамінамі, дадатковымі матэрыяламі.

І тыя і другія віды каталогаў спрыяюць папулярызацыі культурнай спадчыны літаратурна-мемарыяльных музеяў, а таксама дапамагаюць навукоўцам у пошуку матэрыялаў, дыстанцыйным знаёмстве з імі.




Каталог як даведачнае выданне з'яўляецца базавай інфармацыі пра аўтара таго ці іншага прадмета, гісторыі яго бытавання, стварэння. Акрамя гэтых звестак, адносна матэрыяльнай асновы прадмета, навуковыя каталогі ўтрымліваюць бібліяграфію, паказальнікі і іншую інфармацыю. Такім чынам, можна казаць пра тое, што ўключэнне музейных прадметаў у каталог уводзіць яго ў навуковы зварот. Навуковыя каталогі вырашаюць складаныя задачы атрыбуцыі помнікаў гісторыі і культуры. З іншага боку, калі звярнуцца да аналізу ўступных артыкулаў каталогаў, можна сцвярджаць, што ў іх утрымліваюцца асноўныя звесткі па матэрыялу каталога, абазначаецца кола яго праблем, звязаных з даследаваннем той ці іншай галіны, якую прадстаўляе выданне.

Такім чынам, можна казаць пра навуковую каштоўнасць каталогаў навуковага і навукова-папулярнага тыпаў, якія з'яўляюцца каштоўнымі другаснымі крыніцамі для вывучэння прадметаў гісторыка-культурнай спадчыны, захоўваемай у фондах музеяў. Яны ў тым ліку дапамагаюць скласці ўяўленне пра калекцыі музея, а суаднясенне розных выданняў, якія выходзілі ў розныя перыяды развіцця ўстановы, дае ўяўленне пра дынаміку развіцця калекцый музея.

---

*1.* «На добры ўспамін…»: фатаграфіі Уладзіславы Францаўны Луцэвіч: каталог / уклад. Л. У. Еўменава [і інш.]. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2016. – 192 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2.* Основы музееведения : учеб. пособие / Э. А. Шулепова (отв. ред.). – Изд. 2-е, испр. – М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2010. – 432 с.

*3.* «Паўлінка». Афішы да спектакля па аднайменнай п’есе Янкі Купалы: каталог / уклад. Д. А. Рашчынскі, Л. Д. Еліневіч. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2014. – 95 с.

*4.* Рукапісная спадчына Янкі Купалы: каталог: частка ШШ / уклад. А. У. Бурбоўская, М. І. Плаўская, Н. В. Саевіч ; уступ А. Р. Мацевасян ; навук. рэд. і аўтар пасляслоўя В. П. Рагойша. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2010. – 268 с.

*5.* «Ты гэтых вачэй не забудзь…»: фатаграфіі Янкі Купалы : каталог / уклад. Н. В. Саевіч. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2014. – 266 с. : фот.

*6. Щурина, Е. Г.* Каталогизация музейного собрания. Система музейных каталогов. Подготовка к изданию каталогов музейных собраний / Е. Г. Щурина // Вестник Кирилло-Белозерского музея [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.kirmuseum.ru. – Дата доступа : 3.12.2015.

*7. Юренева, Т. Ю.* Музееведение : учеб. для высшей школы / Т. Ю. Юренева. – 2-е изд. – М. : Академический Проект, 2004. – 560 с.

***Е. А. Подорожняя,***
*кандидат исторических наук,*
*старший преподаватель кафедры*
*истории Беларуси и музееведения*

## ГОСУДАРСТВЕННАЯ ПОЛИТИКА ПО ОХРАНЕ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ БЕЛАРУСИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

Во второй половине XIX – начале XX в. было положено начало формирования и развития государственной системы и общественного движения по охране памятников культуры. В понятие «памятник старины» (или «памятник древности») вошли не только античные раритеты, монеты и «курганные вещи», но и монастыри, храмы, церковная утварь, уникальные документы, старопечатные книги, рукописи [5, с. 136]. Во второй половине XIX в. научный лексикон пополнился понятием «памятник архитектуры», что связано с развитием этого направления исследований. При императоре Николае I местные власти обязались собирать сведения о древних зданиях и городской застройке, конфисковать памятники древней истории; их запрещалось разрушать или проводить реставрацию

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ